■ Песню бярыце з сабою...

# МАМА ВЕДАЛА ЎСЁ

**Сёння хачу падзяліцца з чытачамі, як была напісана гэтая песня.**

— З Юрасём Свіркам я пазнаёміўся на адной з чытацкіх сустрэч у Цэнтральнай бібліятэцы ў Мінску ў 90-я гады. Тады мяне вельмі ўразілі і добразычлівасць аўтара, і яго пачуццё роднага слова, і тая шчырасць, з якой ён чытаў «Мама ведала ўсё». Я нават застаўся пасля сустрэчы ў чытальнай зале, дзе на стэндзе стаялі ўжо выдадзеныя раней кніжкі аўтара. Знайшоў гэты верш, перапісаў яго ў свой запаветны сшытак любімых вершаў. Назаўтра я ўжо яго ведаў на памяць, і неяк сама сабой да яго прыдумалася мелодыя, якая потым была пакладзена на ноты. Праз некаторы час, выпадкова сустрэўшы паэта ў кнігарні, я прызнаўся яму, што літаральна на другі дзень пасля вечарыны напісаў песню на яго вершы. Помню як сёння, Юрась усміхнуўся і заззначыў:

— Дык ты напісаў песню за адзін дзень?

— Так, — адказаў я.

— Вельмі дзіўна, гэты верш я напісаў таксама на адным дыханні...

Я вельмі рады, што быў знаёмы з такім аўтарам, і да сённяшняга дня з цеплынёй успамінаю гэтыя першыя сустрэчы.



**Юрась СВІРКА (1933—2004).**
**Вядомы беларускі паэт. Аўтар паэтычных кніжак, сярод якіх «Шэпчуцца ліўні», «Вечнасць», «Крэўнасць», «Аўтограф», «Люблю і веру», «Узаемнасць». Два дзесяцігоддзі загадваў аддзелам прозы і паэзіі ў тыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Лаўрэат літаратурнай прэміі імя А. Куляшова.**




**Куплет 1:**
*Мама ведала ўсё: і як жыць,*
*і як ткаць,*
*Як цярпліва дзяцей*
*чарадой гадаваць.*
*Мама ведала ўсё:*
*лекі траў, лекі слоў,*
*Не збівалася*
*ў часе прылёту буслоў.*

**Прыпеў:**
*Мама ведала ўсё, мама ведала,*
*Мама сэрца сваё*
*назаўжды аддала.*
*Мама ведала ўсё, мама ведала,*
*Мама сэрца сваё*
*назаўжды аддала.*

**Куплет 2:**
*Мама ведала ўсё:*
*па туману, па шэпту бяроз*
*Вызначала пагоду —*
*і дождж, і мароз.*
*Мама ведала ўсё: дзе маўчаць,*
*а дзе — голас падаць.*
*Таямніцу матуліну*
*мне б разгадаць.*

**Куплет 3:**
*Мама ведала ўсё:*
*нават тую сасонку (О, жах!),*
*Пад якой на пагосце*
*ёй вечна ляжаць.*
*...Пад якой на пагосце*
*ёй вечна ляжаць.*
*Мама ведала ўсё,*
*мама ведала...*

**Яўген КСЯНЕВІЧ, кампазітар-песеннік, куратар мастацкіх і музычных праектаў, калекцыянер мініяцюрнай кнігі. Аўтар песень на вершы беларускіх паэтаў**

■ Ну і ну!

## Выкопваў у лесе... кабель

**Позна ўвечары ў лесе каля вёскі Глівін пад Барысавам дзяржінспектары затрымалі жыхара райцэнтра, які спрабаваў украсці... кабель «Белтэлекама».**

Як паведамілі ў Дзяржінспекцыі, мужчына ўжо выкапаў некалькі ям і зрабіў мацаванні, за якія ён збіраўся выцягваць правады. Пры сабе зламыснік меў нажоўку, аднак перарэзаць кабель ёй яшчэ не паспеў. На месца затрымання прыбылі супрацоўнікі Барысаўскага РУУС, якія падзякавалі дзяржінспектарам і расказалі, што гэта не першы выпадак крадзяжу кабелю дзеля каляровых металаў.

## Піратэхніка на $20 000

**Супрацоўнікі Ленінскага РУУС сталіцы канфіскавалі піратэхнічныя вырабы, якія захоўваліся ў падвальным памяшканні жылога дома на праспекце Ракасоўскага, што парушае патрабаванні заканадаўства аб захаванні такой прадукцыі.**

Піратэхніка належала індывідуальнаму прадпрымальніку, які з сям'ёй пражывае ў гэтым жа доме. Паводле слоў гаспадара прадукцыі, агульны кошт канфіскаванага тавару складае каля 20 тысяч долараў. Міліцыянеры налічылі больш за 150 тысяч канчаткова. Вядома, што продаж піратэхнічных вырабаў — асноўны заробак жыхара мікрараёна Серабранка. Па гэтым факце праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.23 | 16.47 | 7.24 |
| Віцебск — | 9.20 | 16.29 | 7.09 |
| Магілёў — | 9.13 | 16.37 | 7.24 |
| Гомель — | 9.01 | 16.43 | 7.42 |
| Гродна — | 9.37 | 17.04 | 7.27 |
| Брэст — | 9.29 | 17.14 | 7.45 |

## Месяц

*Маладзік 18 снежня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

**Пр.** *Андрэя, Георгія, Івана, Мікалая, Савы, Сафрона, Фёдара.*
**К.** *Аліцыі, Альбіны, Ясея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 16 СНЕЖНЯ

**1773** год — адбылася акцыя пратэсту амерыканскіх каланістаў, якая ўвайшла ў гісторыю як «Бостанскае чаяпіцце». Гэта адбылося пасля таго, як брытанскі ўрад выдаў так званы «Чайны закон», які дазволіў Ост-Індыйскай кампаніі напрамую прадаваць чай у паўночнаамерыканскіх калоніях па цане ўдвая ніжэйшай, чым раней, а таксама танней, чым у Вялікабрытаніі і ў любых мясцовых чайных гандляроў і кантрабандыстаў. І вось калі 16 снежня ў бостанскую гавань прыйшоў чарговы карабель з чаем Ост-Індыйскай кампаніі, каланісты, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы індзейцаў і ўзброеныя сякерамі і дубінамі, пракраліся на борт судна і хутка спустошылі трумы, выкінуўшы за борт каля 45 тон гарбаты. Гэта падзея і ўвайшла ў гісторыю як «Бостанскае чаяпіцце», якое стала адным з каталізатараў Вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы.



**1775** год — нарадзілася Джэйн Осцін, англійская пісьменніца-раманістка. Яна — адна з нешматлікіх жанчын свайго часу, якія не проста дабіліся поспехаў у літаратуры, але і здолелі застацца папулярнымі аж да нашых дзён. Яе раманы аб'ядноўваюць у сабе іронію, тонкі псіхалагізм і аналіз сучасных ёй сацыяльных рэалій.

**1882** год — нарадзіўся (в. Лябёдка, цяпер у Шчучынскім раёне) Тадэвуш Іваноўскі, натуразнаўца, прафесар. У 1910 годзе скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. Заснаваў Лабараторыю прыродазнаўчых навук у Пецярбургу, дзе і працаваў да 1915 года. У 1914 і 1917 гадах удзельнічаў у навуковых экспедыцыях каля берагоў Баранцавага мора, дзе збіраў матэрыялы для заалагічных музеяў. У 1919-м адкрыў у Каўнасе прыродазнаўчую даследчую станцыю з заалагічным музеем і кіраваў ёю. У 1940—1964 гадах загадваў кафедрай заалогіі Віленскага ўніверсітэта. Памёр у 1970 годзе.

**1962** год — нарадзіўся (в. Ракаў Валожынскага раёна) Валяр'ян Язэпавіч Янушкевіч, беларускі скульптар. Сярод работ: помнікі А. Міцкевічу ў Навагрудку і Лідзе, Ф. Скарыну ў Лідзе, мемарыяльныя дошкі Ф. Скарыны ў Ягелонскім (г. Кракаў, Польшча) і Падуанскім (г. Падуя, Італія) універсітэтах, скульптурная кампазіцыя пад агульнай назвай «Хросны шлях» у касцёле Святога Роха ў Мінску і інш.

Было сказана

**Цім БЁРТАН, амерыканскі кінарэжысёр, прадзюсар і пісьменнік:**

*«Не ганарыся сваім выглядам, таму што не ты яго ствараў. Ганарыся сваёй душой. Ты з'яўляешся яе скульптарам».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Каб пасля сексу муж не адварочваўся да сценкі, Сафачка павесіла на сценку фатаграфію сваёй мамы.**

— Што такое бясконцасць?

— Эстонцы лічаць кітайцаў.

**Учора ў горадзе дзёрзка абрабавалі краму «Усё для рыбалкі». Мяркуючы па ўкрадзеным, зламыснікі ідуць на ляшча.**

— Вова, ты з кім у садку гуляеш?

— З хлопчыкамі.

— А чаму з дзяўчаткамі не гуляеш?

— Грошай няма!

**Міжсезонне ў траўматолагаў — гэта калі матацыклісты ўжо скончыліся, а сноўбардысты яшчэ не пачаліся.**

Жонка кажа мужу:

— Дарагі, ты ўяўляеш, сёння прачытала ў адным часопісе, што ў некаторых плямёнах Афрыкі мужы прадаюць сваіх жонак! А ты б мяне змог прадаць?

— Што ты, каханая! Я б цябе падарыў!

**Усе хочуць дабра. Пільна прыглядайце за сваім дабром!**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4737.

Нумар падпісаны ў 19.30 15 снежня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12